обязательным условием для допуска к аттестации. Так, например, при проведении аттестации оценщиков, претендент должен быть дееспособным физическим лицом, постоянно проживать на территории Республики Беларусь и иметь высшее экономическое, юридическое или техническое образование, а требование о стаже к нему не предъявляются.

Таким образом, целесообразно отказаться от требования о наличии стажа работы по юридической специальности как обязательного условия для претендента на получение свидетельства об аттестации юриста, при необходимости заменив его оценкой практических навыков в рамках аттестационного экзамена.

**Литература**

1 О лицензировании отдельных видов деятельности: Указ Президента Республики Беларусь от 1 сентября 2010 № 450 // Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь. – 2010. – № 212. – 1/11914.

2 Юридические услуги // Сайт Министерства юстиции Республики Беларусь [Электронный ресурс]. – 2014. – Режим доступа: http://www.minjust.by/ru/site_menu/license/legal_services. – Дата доступа: 10.04.2014.

3 О некоторых вопросах лицензирования деятельности по оказанию юридических услуг: постановление Министерства юстиции Республики Беларусь от 07 марта 2014 г. № 58 // Сайт Министерства юстиции Республики Беларусь [Электронный ресурс]. – 2014. – Режим доступа: http://www.minjust.by/ru/site_menu/license/legal_services. – Дата доступа: 11.04.2014.

4 Порядок проведения аттестации // Сайт Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь [Электронный ресурс]. – 2014. – Режим доступа : http:// www.gki.gov.by/activity_branches/val/vcert/bf785d534abcala3.html. – Дата доступа: 11.04.2014.

**УДК 745.521:392.51(476.2–37 Акцябрскі)**

***В. В. Гардзей***

## МАСТАЦКІЯ ТКАНІНЫ Ў ВЯСЕЛЬНАЙ АБРАДНАСЦІ ЖЫХАРОЎ АКЦЯБРСКАГА РАЁНА ГОМЕЛЬСКАЙ ВОБЛАСЦІ

*Артыкул прысвечаны традыцыям абрадавай культуры насельніцтва Акцябрскага раёна Гомельскай вобласці. Даследаванне праведзена на падставе арыгінальных этнаграфічных матэрыялаў, сабраных аўтарам пад час палявой экспедыцыі ў Акцябрскім раёне за перыяд 2013–2014 гг. Вызначана пашыранасць выкарыстання мастацкіх тканін (посцілак, ручнікоў, абрусаў і інш.) на розных этапах вясельнай абраднасці вяскоўцаў Акцябрскага раёна ў другой палове 20 ст. і сёння.*

Мастацкія тканіны шырока выкарыстоўваюцца не толькі ў паўсядзённым жыцці, але і ў каляндарных і сямейных святах беларусаў [1, с. 270]. Асабліва вядомы ручнікі і абрусы ў вясельных абрадах насельніцтва Акцябрскага раёна. Некаторыя мастацкія тканіны застаюцца ўстойлівым атрыбутам на вяселлі мясцовых жыхароў і сёння, таму гэта тэма з’яўляецца вельмі актуальнай.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Мэта даследавання – на падставе арыгінальных этнаграфічных матэрыялаў, сабраных у час этнаграфічнай экспедыцыі ў вёсках Акцябрскага раёна, вызначыць месца мастацкіх тканін у вясельных абрадах мясцовых жыхароў. Падчас экспедыцыйна-палявой работы было апытана 14 чалавек, з іх 12 жанчын і 2 мужчын узросту ад 50 да 80 гадоў. Усе яны карэнныя жыхары вёсак. За гэты ж час было абследавана 8 сем'яў, у якіх захоўваюцца і выкарыстоўваюцца мастацкія тканіны ўласнай вытворчасці да сённяшняга часу.

Да вяселля беларусы заўсёды рыхтаваліся загадзя. «На вяселле, ды і на любое другое свята ўсю хату завешвалі ручнікамі і пасцілкамі. Таму загадзя клапаціліся, каб да свята яны былі натканы. Выбіралі звычайна беленькія, вышытыя кветкамі і галубкамі ручнікі і вешалі іх на сцены. Асабліва старанна прыбіралі пасцель, якую засцілалі новымі пасцілкамі і навалачкамі. Падлогу таксама засцілалі новымі дарожкамі», – расказвае жыхарка в. Любань Піскун Роза Цітаўна, 1949 г. н.

Пачыналася вяселле з заручын, на Акцябршчыне важную ролю адыгрываў звычай адорваць бацькоў жаніха, сватоў. У якасці сімвала збліжэння з роднымі маладога ім дарыліся такія падарункі, як хустка, палатно, ручнік. Каб паказаць сваю згоду выйсці замуж, дзяўчына на заручынах давала будучаму свёкру ручнік. Кашуля была для апошняга асноўным падарункам ад нявесткі. У вясельнай песні ў в. Любань, запісанай ад Шпак Екацярыны Ігнацьеўны, 1930 г. н., адзначаецца:

*Гэта мая Кацечка песні пяе,*
*У новай святліцы седзячы,*
*Свекру кашулю шыючы.*

«Раней нявеста павінна была ўсіх адарыць падарункамі. А раней жа былі вялікія сем'і, таму і я, як свякруха, дапамагала нявесце рыхтаваць падарункі. Памятаю ўсім мужчынам нарыхтавала кашуль і аддала нявесце, каб ёй лягчэй было», – паведамляе жыхарка в. Загалле Гардзей Алена Кузмінічна, 1946 г.н. Дары ад нявесткі атрымлівала і свякруха. Маладая надзяляла яе наміткамі, ручнікамі. Хросныя маці і бацька атрымлівалі ад маладой палатно, наміткі. Ручнікі былі самымі распаўсюджанымі падарункамі сватам ад нявесты:

*А Кацечка ночку не спала,*
*Ручнікі катала,*
*Укачаны, пабелены,*
*У сватам нарэзаны.*

Сватоў на запоінах абвязвалі ручнікамі. Свата павязвалі ільняным ручніком цераз правае плячо, што азначала, што гэты чалавек на вяселлі будзе галоўным, яму адводзілася роля кіравання вяселлем. Пасля запоін нявеста шыла для будучага супруга шлюбную кашулю, вышывала каўнерык, манжэты і ўвесь ніз па кругу. Пляла пояс. Гэтую кашулю, белую, з тонкага кужалю, малады павінен быў надзець у дзень вяселля. Жаніх таксама дарыў нявесце хустку. Абмен падарункамі – знак згоды.

Атрымоўвалі мастацкія тканіны ў якасці падарункаў і маладыя. Самыя здольныя майстрыхі адорвалі іх рознакаляровымі пасцілкамі, якія можна бачыць у шматлікіх хатах у вёсцы і зараз. Кузьмянок Зоя Сцяпанаўна, 1973 г.н., якой Шпак Кацярына Ігнацьеўна на вяселле дарыла пасцілкі, расказвае: «Гэта вельмі прыемна выкарыстоўваць саматканыя пасцілкі, калі ты ведаеш, што яны натканы рукамі тваіх родных. Тым прыемней, што ўжо колькі год прайшло, а яны ўсё такія прыгожыя і рознакаляровыя. Не менш за гэта яны падабаюцца і дзецям».

Абавязкова ў час вянчання ў храме маладыя павінны былі стаяць на ручніку. Пры гэтым трэба было памятаць, што пад ручнік неабходна пакласці чырвоны пояс–абярэг. Гэты ручнік нельга было вышываць ружамі і галубкамі, каб становячыся на яго не затаптаць сваё шчасце. Неабходны ў час вянчання быў яшчэ адзін ручнік, якім святар звязваў рукі маладых. Пасля вянчання гэты ручнік трэба было акуратна зняць, звязаць вузел і захоўваць яго так ўсё жыццё.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Пасля вяселля з галавы маладой свякруха здымала вянок і павязвала хустачку мужа. Яшчэ перад тым, як маладыя ішлі да вянца, іх павязвалі ручніком і тры разы абводзілі вакол дзяжы, якая была накрыта кажухом. Вадзіў брат родны, альбо дзядзька. Звычайны ручнік быў доўгім і выконваў важную абрадавую функцыю:

*А брат сястру вядзець,*
*Ен ручніком мяцець,*
*Ен шоўкам памятаіць,*
*Золатам пасыпаіць.*

Гэты фрагмент фальклорнага твору быў запісаны аўтарам ад Ахраменкі Таццяны Андрэеўны, 1940 г. н.

Абрад мяцення ручніком «сцежкі» – сімвал светлай будучыні, шчаслівага лёсу, якога жадае маладой радня. Абрадавая цырымонія пакрывання галавы нявесты хусткай была заключнай часткай пасага, які адбываўся звычайна ў канцы вяселля, перад ад’ездам нявесты да жаніха.

Перад ад’ездам маладога ў сваты да маладой бацькі давалі яму розныя парады. Асабліва ўвагу звярталі на пасаг нявесты, яе працавітасць, уменне прасці, ткаць, аб гэтым спявалася ў народнай песні, якая была запісана ад Лук’яновіч Паліны Міхайлаўны, 1950 г. н.:

*Не глядзі Івана на наметачку,*
*Паглядзі Іванка на работачку:*
*Ці ўмее Полечка тонка прасці,*
*Ці ўмее Полечка бела бяліці,*
*Ці ўмее Полечка хораша пашыці.*

Асаблівая ўвага надавалася таму, што вышыць ручнікі да вяселля нявеста павінна была сама. У час вышывання нельга было думаць аб дрэнным ці сварыцца, каб ў будучым у жыцці маладых усе было добра. Ні ў якім разе нельга было браць на вяселле чужыя ручнікі, каб не паўтараць жыццё тых людзей. Акрамя гэтага, прыгожа трэба было вышываць не толькі вонкавую старану, але і ўнутраную, без вузлоў, каб жыццё маладых было добрае не толькі для людзей, як кажуць, на паказ, але і ўнутры сям’і.

Ручнікі, наміткі, хусткі, кашулі, палатно былі неад’емнымі атрыбутамі вяселля жыхароў Акцябрскага раёна ў мінулым. Ручнікі і абрусы шырока выкарыстоўваліся на розных этапах вяселля. Прысутнасць ручнікоў і абрусаў у вясельных абрадах Акцябрскага раёна прасочваецца і сёння. Павязванне ільнянога ручніка хросным бацькам маладых, засціланне ручніка пад ногі маладым ў час рэгістрацыі шлюбу і пераступанне яго як сімвал уступлення ў новае жыццё маладых (у гэты час усе сочаць за тым, хто першы з маладых пераступіць ручнік, бо лічыцца, што той і будзе галоўным у сям’і), сустрэча бацькоў маладых з хлебам і соллю на абрусе, здыманне свякрухай фаты нявесты і завязванне хустачкі, а таксама абавязковы падарунак абраза з ручніком маладым ад бацькоў, якія яны павінны захаваць на ўсё жыццё, – з’яўляюцца яскравымі прыкладамі захавання старажытных традыцый і іх гарманічнага спалучэння з сучаснымі культурнымі традыцыямі на Беларусі.

**Літаратура**

1 Беларусы: у 8 т. Т. 5: Сям’я / Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы; В. К. Бандарчык, Г. М. Курыловіч, Т. І. Кухаронак [і інш.]; пад рэд. В. К. Бандарчыка. – Мінск: Беларуская навука, 2001. – 375 с.

**УДК 94(47+57):338.245»196/198»**

***Э. Л. Гарцуев***

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ